# Культура Беларусі
# ў другой палове *XVII – XVIII* ст.



# План

1. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры

2. Развіццё асветы і навукі

3. Мастацтва

4. Прыгонны тэатр

5. Мастацкія вырабы мануфактур

# Гістарычныя ўмовы развіцця культуры

Сярэдзіна XVII ст. стала пачаткам разбуральнага веку ў гісторыі Беларусі, умовы развіцця культуры былі ўскладнены шматлікімі войнамі:

- ✔ 1648-1651 гг. – казацка-сялянская вайна, якая мела характар антыфеадальнай барацьбы і закончылася паражэннем паўстанцаў;
- ✔ 1654-1667 гг. – вайна Расіі з Рэччу Паспалітай.

У выніку войнаў беларускае насельніцтва прымусова перасялялася ў Расійскую дзяржаву. Вялікая колькасць жыхароў беларускіх зямель апынулася ў Маскве, дзе пасялілася ў Мяшчанскай слабадзе.

Беларускія майстры будавалі і ўпрыгожвалі многія храмы і палацы Масквы і Падмаскоўя.



**Іканастас Смаленскага сабора**

Майстры на чале са шклоўскім разьбяром Клімам Міхайлавым стварылі сапраўдны шэдэўр - пяціярусны разны пазалочаны іканастас у Смаленскім саборы маскоўскага Новадзівочага манастыра.

Беларускія майстры выканалі ўсе разьбярныя работы па вонкавым і ўнутраным убранні драўлянага Каломенскага палаца цара Аляксея Міхайлавіча.



**Палац у сяле Каломенскім**

У Маскве працавалі гандляры, а таксама беларускія майстры 52 спецыяльнасцей. Асаблівую славу і попыт набыла невядомая раней у Маскве шматколерная рэльефная кафля (керамічны выраб):

- “мураўленая” (з празрыстай зялёнай палівай)
- і “канінная” (размаляваная непразрыстай эмаллю розных колераў).





**Галоўны фасад рэзідэнцыі мітрапалітаў. Кафля**

На развіццё культуры адмоўна паўплывалі падзеі Паўночнай вайны (1700-1721 гг.). Баявыя дзеянні Расіі на чале з Пятром I, Даніі, Саксоніі, Рэчы Паспалітай супраць Швецыі разгарнуліся на тэрыторыі Беларусі. У час вайны былі зруйнаваны і спалены многія гарады і вёскі.

Гістарычныя ўмовы развіцця культуры былі звязаны таксама з узмацненнем працэсу акаталічвання. У XVII-XVIII стст. у ВКЛ гаспадарыла цалкам апалячаная беларуская шляхта. Беларуская мова страціла статус мовы афіцыйнага справаводства, дзяржаўнымі былі абвешчаны польская і лацінская. Беларускамоўнай заставалася пераважна народная культура.



**Пётр I**

У другой палове XVIII ст. на Беларусь з Еўропы пранікаюць ідэі Асветніцтва, якія абвяшчалі прыярытэт асветы, навукі, розуму ў жыцці асобы, грамадства, дзяржавы. Грамадскім ідэалам становіцца адукаваны чалавек. Пашырэнню асветніцкіх ідэй спрыялі навуковыя адкрыцці ў прыродазнаўчых навуках і дасягненні ў галіне гуманітарных ведаў.




**Жан Жак Русо**

На Беларусі былі вядомы творы Ф. Вальтэра, Д.Дзідро, Ш.Мантэск'ё, Ж.-Ж.Руссо і іншых французскіх асветнікаў.



**Ф.Вальтэр**

Пад кіраўніцтвам французскага вучонага Ж.Жылібера пачала дзейнічаць медыцынская школа у Гародні, пры якой былі створаны аптэка, анатамічны музей, батанічны сад, бібліятэка. Падобных школ не было ні ў Расіі, ні ў Рэчы Паспалітай.



Ж.Жылібер



Гародзенская медыцынская школа. Сучасны выгляд

# Умовы развіцця культуры Беларусі

- **“Разбуральнае стагоддзе”**
  - **Анты-феадальна я вайна 1648-1651 гг.**
  - **Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.**
  - **Паўночная вайна 1700-1721 гг.**
- **Узмацненне працэсу акаталічвання**
- **Распаўсюдж-ванне ідэй Асветніцтва**



# Развіццё асветы і навукі

Школьная справа заставалася ў руках каталіцкай і уніяцкай царквы. Адукацыя была даступная пераважна шляхецкім дзецям. Выкладанне вялося на лацінскай і польскай мовах. Вывучаліся “сем вольных мастацтваў”: граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка.

Цэнтрам адукацыі і навукі была Віленская акадэмія (з 1781 г. – Галоўная школа ВКЛ), якая мела статус універсітэта.

Высокі ўзровень адукацыі забяспечвалі езуіцкія калегіумы.



**Полацкі езуіцкі калегіум**

У 1773 г. была створана Адукацыйная камісія (першае ў Еўропе міністэрства адукацыі), якая за 20 гадоў дзейнасці адкрыла 20 школ сярэдняй ступені. Паспяховае заканчэнне іх давала магчымасць паступлення ў Кракаўскі і Віленскі універсітэты. Дзякуючы намаганням камісіі на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 200 пачатковых школ, сярод іх навучэнцаў 30% складалі сялянскія дзеці.




<u>Вынікі рэформы адукацыі 1770-1790-х гг.</u>:

- даступнасць адукацыі
- свецкі характар
- выкладанне на польскай мове замест латыні
- увага да развіцця разумовых здольнасцей дзяцей.

Славутыя традыцыі кнігадрукавання працягваліся ў XVIII ст., колькасць друкарань павялічылася да 11. У 1776 г. выйшла ў свет першая газета на тэрыторыі сучаснай Беларусі – “Газета Гродзеньска” (на польскай мове).

Кнігавыдавецтвам у Амстэрдаме (Галандыя) заняўся ўраджэнец Мсціслаўшчыны Ілья Капіевіч. Тут ён пазнаёміўся з маладым Пятром І, па даручэнні якога падрыхтаваў і выдаў першы дапаможнік па матэматыцы на рускай мове.

Запрошаны ў Маскву, Капіевіч выдаў першыя рускамоўныя падручнікі па граматыцы, рыторыцы і інш. (больш за 20 кніг).



Ілья Капіевіч (1651-1740)

Акрамя таго, І.Капіевіч стаў стваральнікам новага грамадзянскага шрыфту, выдаў першы ў Расіі каляндар, карту зорнага неба, слоўнікі “руска-лацінска-нямецкі” і “руска-лацінска-галандскі”.

Сярод вядомых вучоных – Казімір Семяновіч – аўтар кнігі “Вялікае мастацтва артылерыі”, якая мела поспех ва ўсёй Еўропе.



**Шматступенчатая ракета**

Ён адным з прешых стварыў праект шматступенчатай ракеты і лічыцца папярэднікам Цыялкоўскага і Каралёва.




**Казімір Семяновіч (каля 1600-пасля 1651)**



Вучоны-прыродазнавец Марцін Пачобут-Адляніцкі вывучаў планету Меркурый, адкрыў невядомае сузор’е, вызначыў каардынаты шматлікіх населеных пунктаў на тэрыторыі Беларусі, рэктар Галоўнай школы ВКЛ.

**М.Пачобут-Адляніцкі**

Адным з найбольш значных дзеячаў беларускай і рускай культуры стаў ураджэнец Полацка, паэт, вучоны, мысліцель і асветнік Сімяон Полацкі. Ён закончыў Кіева-Магілянскі калегіум, Віленскі універсітэт. Абставіны жыцця прымусілі С.Полацкага выехаць у Маскву.



Сімяон Полацкі (1629-1680)

С.Полацкі стаў настаўнікам дзяцей цара Аляксея Міхайлавіча, у тым ліку васьмігадовага Пятра I, для якога С.Полацкі надрукаваў у адчыненай ім друкарні “Буквар языка славенскага”.

Па яго ініцыятыве была створана першая ў Расіі вышэйшая навучальная ўстанова – Славяна-грэка-лацінская акадэмія.



Славяна-грэка-лацінская акадэмія

Паводле твора С. Полацкага “Рыфмалагіён”, студэнт гэтай акадэміі М. Ламаносаў упершыню пазнаёміўся з вершаскладаннем.



РУѲМОЛОГІОН
или
СТІХОСЛОВЪ

“Рыфмалагіён”

С.Полацкага лічаць першым у Расіі прафесійным пісьменнікам. Ён стварыў зборнік “Ветраград мнагацветны”, у якім у алфавітным парадку размешчаны вершы, што ўтрымлівалі звесткі з розных навук, - гісторыі, геаграфіі…




**“Ветраград мнагацветны”**



**Рукапісы і выданні С. Полацкага**

С.Полацкі стаяў ля вытокаў першага ў Расіі тэатра, адчыненага пры царскім двары ў 1672 г., у якім частку акцёраў складалі жыхары Беларусі, вывезеныя з яе тэрыторыі.

Галоўнай справай жыцця ўраджэнца Берасцейшчыны Казіміра Лышчынскага стаў роздум аб чалавеку і яго боскім пачатку. У трактаце “Аб неіснаванні Бога” ён пісаў: “Чалавек – стваральнік бога, і бог з’яўляецца не сапраўднай існасцю, а стварэннем розуму…”.



Казімір Лышчынскі (1634-1689)

Ён выказваў думку, што наша планета – не цэнтр Сусвету, выбраны Богам, а адзін з нямгногіх населеных аб’ектаў. Рукапіс К.Лышчынскага трапіў у рукі царкоўнікаў, якія запатрабавалі смяротнай кары.

К.Лышчынскі быў абезгалоўлены і спалены на кастры на плошчы ў Варшаве па прыгаворы суда Рэчы Паспалітай, а попелам зарадзілі гармату і стрэлілі з яе.



# Мастацтва

У XVIII ст. цэнтрамі развіцця мастацтва становяцца магнацкія рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы, Сапегаў – у Ружанах, Агінскіх – у Слоніме, Тызенгаўзаў – у Гародне і інш.



**Палац Радзівілаў у Нясвіжы**



**Палац Сапегаў у Ружанах**

Паводле праектаў лепшых еўрапейскіх архітэктараў узводзяцца і перабудоўваюцца магнацкія палацава-замкавыя комплексы.

У канцы XVIII ст. быў пабудаваны палац М.Румянцава ў Гомелі.

Пашыраецца палацава-паркавая архітэктура, звязаная з будаўніцтвам у магнацкіх рэзідэнцыях паркаў са шматлікімі вадаёмамі, каналамі, каменнымі гротамі і г.д. Від парка – “пейзаж” – адыгрываў асноўную ролю пры яго планаванні.



**Парк у рэзідэнцыі Румянцавых**



**Віцебская ратуша**

У гарадах , якія мелі магдэбургскае права, будуюцца ратушы – неад’емныя прыкметы вольнага горада.

З XVI ст. вызначальным стылем у архітэктуры з’яўляецца барока, якому ўласцівы манументальнасць, раскоша ва ўбранстве будынукаў, двухвежавы фасад.

Паводле праекта польскага архітэктара Я.Глаўбіца ў 1743-1746 гг. быў перабудаваны ў стылі віленскага барока уніяцкі Сафійскі сабор у Полацку, які значна пацярпеў у гады Паўночнай вайны ад выбуху пораху, пад склад якога быў прыстасаваны расійскімі войскамі. Дзве ажурныя вежы, размешчаныя па баках будынка, паступова звужаюцца ўгару і ствараюць уражанне вышыні і зграбнасці сабора.



**Полацкі Сафійскі сабор**



Станіслаў Аўгуст Панятоўскі

У жывапісе папулярным заставаўся партрэтны жанр. Пры двары польскіх каралёў працавалі прафесійныя еўрапейскія майстры, палотны якіх сталі своеасаблівай школай для мясцовых мастакоў.

Так, еўрапейскім майстрам быў створаны партрэт Міхала Казіміра Агінскага, а нясвіжскім мастаком Ю.Гескім – партрэт апошняга караля Рэчы паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага.



# Прыгонны тэатр

Самай яркай з’явай беларускай культуры гэтага часу стаў прыгонны тэатр. Найбольшую вядомасць набылі прыватнаўласніцкія тэатры Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку і Міхала Казіміра Агінскага ў Слоніме, які быў празваны “сядзібай муз”.

У ім адбываліся грандыёзныя прадстаўленні на сцэне, памеры якой дазвалялі заязджаць на яе на конях. Частка сцэны ўяўляла сабой басейн для водных прадстаўленняў.



Міхаіл Агінскі (1730-1800)

Тэатр умяшчаў 2500 гледачоў. Сам Міхал Казімір Агінскі быў высокаадукаваным, адораным чалавекам, сярод яго асабістых сяброў быў Іозеф Гайдн, якому ён падказаў сюжэт араторыі “Стварэнне свету”.



**Францішка Уршуля Радзівіл**

Найбольш папулярнымі тэатральнымі творамі сталі "Камедыі і трагедыі", гаспадыні Нясвіжа пісьменніцы Францішкі Уршулі Радзівіл. У аснову пакладзены сюжэты з антычнай міфалогіі і сярэдневяковых твораў.

Многія выхаванцы прыгонных тэатраў праслаўлялі сцэны Варшавы і Пецярбурга.

У другой палове XVII-XVIII ст. па-ранейшаму дзейнічалі лялечны тэатр (батлейка) і школьныя тэатры пры езуіцкіх калегіумах, якія выконвалі функцыю навучання замежным мовам у час ігры на сцэне.



# Мастацкія вырабы мануфактур

Да дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва належаць вырабы мануфактур. Адна з першых – Урэцкая шкляная мануфактура, якая выпускала люстэркі. Дынастыі мясцовых майстроў выраблялі сталовы посуд з каляровага малочнага шкла і крышталю.



**Урэцкае шкло**



**Габелен “Агляд войска пад Заблудавам”**

Ткацкая мануфактура Радзівілаў па вырабе палатна для абіўкі сцен, бязворсавых дываноў (шпалер) існавала ў Карэлічах.

Сусветную славу мела Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Шырокі шаўковы пояс быў неабходнай часткай магнацкага і шляхецкага касцюма. У якасці ўзору для слуцкіх паясоў паслужылі вырабы, якія з тэрыторыі Малой Азіі і Персіі (адсюль назва мануфактур – персіярні) траплялі на Беларусь. Каштавалі яны вельмі дарага, таму ад куплі паясоў перайшлі да іх вырабу.



**Арнат, аздоблены ўстаўкай слуцкага пояса**

Першая персіярня ўзнікла ў Нясвіжы, адкуль была перанесена ў Слуцк. Першапачаткова на іх працавалі турэцкія, а потым мясцовыя майстры. Вялікая калекцыя паясоў мелася ў Нясвіжскім палацы Радзівілаў.

Зрабіце тэст па тэме